2. Музеи Беларуси [Электронный ресурс] / Каталог. Минская область. – Режим доступа: http://museum.by/catalog?region=441. – Дата доступа: 23.08.2020.
3. Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік «Нясвіж» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://niasvizh.by/be/. – Дата доступа: 23.08.2020.
4. Слуцкий краеведческий музей [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://twitter.com/slutsk_museum. – Дата доступа: 23.08.2020.
5. Museums, museum professionals and COVID-19 [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://icom.museum/wp-content/uploads/2020/05/Report-Museums-and-COVID-19.pdf. – Дата доступа: 23.08.2020.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# НЯСВІЖСКІ КАТЭХІЗІС 1562 г. СЫМОНА БУДНАГА ЯК ПОМНІК РЭЛІГІЙНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

***І. П. Клімаў,***
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры беларускай і замежнай філалогіі*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

Гістарычнае развіццё катэхізічнай літаратуры не было прамым і аднастайным. Хаця першыя вопыты катэхізічных твораў прыпадаюць на сярэдзіну IV ст., яны далей не знайшлі шырокага развіцця. Да пачатку XVI ст. катэхізісамі служылі хутчэй аказіянальныя творы пераважна дыдактычнай ці схаластычнай скіраванасці, у якіх не склалася ні сталага зместу, ні сталай кампазіцыі. Катэхізацыя разглядалася больш як вусная практыка і хутчэй належала да місіянерскай дзейнасці, якая ў эпоху Сярэднявечча знаходзілася на перыферыі клопатаў царквы.

Сітуацыя памянялася ў эпоху Рэфармацыі, калі клопатам царквы ў Заходняй Еўропе стала дасягненне трывалых ведаў пра хрысціянскую рэлігію сярод саміх вернікаў, а не набыццё новых празелітаў. Менавіта ў самім хрысціянскім асяроддзі пачалася шырокая місіянерская дзейнасць, і тут катэхізіс зрабіўся неабходным і асноўным інструментам такой дзейнасці. У выніку ў XVI ст. у катэхізісах тлумачыліся базавыя формулы і паняцці хрысціянскай рэлігіі, пададзеныя абмежаванымі біблейнымі і царкоўнымі тэкстамі (звычайна кароткага

памеру). Шлях да складання гэтых тэкстаў і парадку іх разгляду быў пакручасты.

Ужо першыя казанні біскупа Кірылы Ерусалімскага (сярэдзіна IV ст.) тлумачылі сімвал веры (лац. credo) і малітву «Войча наш». У эпоху ранняга Сярэднявечча да разгляду быў дададзены дэкалог (10 запаветаў Масеевых), а схаластычны вучоны Тамаш Аквінскі (XIII ст.) далучыў разгляд 7 сакрамантаў. Такая чатырохчасткавая структура засталася ў каталіцтве па сённяшні дзень. Звычайна яна выкарыстоўваецца ў катэхізісах, адрасаваных вернікам. Апрача таго, Трыдэнцкі канцыль (1545–1563) увёў ва ўжытак аб'ёмныя катэхізісы для святароў, дзе дэталёва разглядалася яшчэ больш шырокае кола пытанняў (напрыклад, свабоды волі, рэлігійных абрадаў, бессмяротнасці душы). Фактычна такія працы набліжаліся да падручнікаў ці дапаможнікаў па дагматыцы. У эпоху Сярэднявечча розныя аўтары залучалі ў катэхізічныя працы разгляд некаторых малітваў (Анёльскае вітанне (лац. Ave Maria) і інш.) і падвойны евангельскі запавет (наконт любові), а схаласты, якія захапляліся нумералогіяй, любілі дадаваць яшчэ і разнастайныя нумералагічныя пералікі: 7 смяротных грахоў, 7 блаславенняў, 7 дароў Святога Духа, 14 учынкаў міласэрнасці (7 для душы і 7 для цела) і інш. Некаторыя сярэднявечныя аўтары размяшчалі матэрыял у сваіх катэхізічных працах па трох раздзелах. Такі трохчасткавы шаблон паходзіць да трактата «Энхірыдыён» («Кіраўніцтва») Св. Аўгустына, які сгрупаваў накірункі хрысціянскага навучання паводле трох якасцяў – веры, надзеі і любові. У 1-й частцы тлумачыўся сімвал веры, у 2-й – малітва Гасподняя.

Лютар у цэлым пагаджаўся, што каталіцкая царква фармальна захавала 4 структурныя часткі старажытнай катэхізацыі. Аднак у сваім катэхізісе (1529) ён разглядаў ужо 5 кампанентаў, хоць і ў іншым парадку: дэкалог, сімвал веры, «Войча наш» і два сакраманты – хрышчэнне і прычасце (разам з пакаяннем). Кальвін вярнуўся да чатырохчасткавай структуры (хаця фармальна яго Жэнеўскі катэхізіс (1545) мае 5 частак), аб'яднаўшы разгляд двух сакрамантаў у адной частцы і памяняўшы паслядоўнасць частак: напачатку падрабязны разбор сімвала веры і толькі потым дэкалог, малітва «Войча наш»

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і сакраманты. Такі парадак адлюстроўваў пэўныя разыходжанні паміж лютаранамі і кальвіністамі (рэфарматамі) у разуменні рэлігійнасці вернікаў. Свой парадак і змест тлумачэння прапаноўвалі і іншыя пратэстанцкія аўтары XVI ст.: Брэнц, Меланхтан, Хітрэус, Рэгій, Экалампадый, Буцар і інш. Напрыклад, Урсін і Алевітан, аўтары Гайдэльбергскага катэхізіса (1563), пабудавалі яго ў складзе трох частак на ўзор паслання апостала Паўла да рымлянаў: пра грахоўнасць людзей, выкупленне іх грахоў Хрыстом і ўдзячнасць вызваленых ад граху людзей, якія мусяць весці хрысціянскае жыццё. Аднак нават пры такім падыходзе імі ўсё ж разглядаліся традыцыйныя біблейныя і царкоўныя тэксты: у 2-й частцы – сімвал веры і сакраманты, у 3-й – дэкалог і малітва Гасподняя.

Можна зрабіць выснову, што для рэлігійных аўтараў XVI ст. існавалі два падыходы ў парадку кампанентаў: гістарычны (абумоўлены традыцыяй) і лагічны (абумоўлены логікай выкладу). Навацыяй Лютара, якая зрабіла моцнае ўражанне як на вернікаў, так і на рэлігійных пісьменнікаў, быў падзел кароткіх рэлігійных тэкстаў на яшчэ драбнейшыя фрагменты, у якіх ставіліся пытанні і даваліся адказы. Узорам для Лютара служылі школьныя дапаможнікі Сярэднявечча ў пытаннях і адказах – гэта спрыяла лепшаму запамінанню і разуменню матэрыялу. Парадак тых ці іншых тэкстаў у катэхізісе вызначаўся традыцыяй або дактрынальнымі высновамі яго аўтара(ў). Правільнасць, дакладнасць і сістэмнасць разгляду залежала як ад інтэлектуальных здольнасцяў аўтара(ў), так і ад аўдыторыі, якой прызначалася катэхізічная праца.

Да XVI ст. ва Усходняй царкве не існавала катэхізісаў, справу катэхізацыі святары ажыццяўлялі вусна на падставе богаслужбовых тэкстаў і твораў Айцоў Царквы. Першым не толькі беларускім, але і ўсходнеславянскім катэхізісам стаў менавіта пратэстанцкі твор, напісаны Сымонам Будным і надрукаваны на сродкі беларускага магната Мікалая Радзівіла Чорнага (Нясвіж, 1562 г.). Гэты выдатны помнік старажытнага беларускага пісьменства (далей – НК) убачыў свет на старабеларускай мове, хаця і са значнымі дамешкамі царкоўнаславянскай – пераважна з-за цытат, якія часта ўжываюцца ў творы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Безумоўна, Будны мусіў арыентавацца на заходнія ўзоры. НК, як традыцыйны каталіцкі катэхізіс, мае 4 асноўныя часткі, але іх паслядоўнасць нагадвае катэхізіс Лютара. Першым ідзе дэкалог, затым сімвал веры, малітва Гасподняя і сакраманты. Цікава, што ў НК 1-я частка не мае свайго асобнага загалоўка – тут загаловак фактычна дапасуецца да ўсяго твора: *КАТИХИСЇСЪ для детокъ хрїстианьскихъ языка Руского, коротко выложена* (арк. 1). Астатнія часткі ўжо маюць адпаведныя загалоўкі: *Починается вторая часть катихисї о вере* (арк. 106), *Третяя часть катихисї о молитве г(о)с(по)дней* (арк. 165 адг.), *Четверътая часть катихисї о таинехъ* (арк. 210 адг.). На першыя дзе часткі прыпадае амаль 2/3 аб'ёму выдання. На пачатку 2-й часткі Будны падае агульны план свайго выдання: *Поведелъ есь на початку сеє розмовы, яко чотыри суть части наоуки Хр(ис)тїанской, и сказалъ есь яко першая част естъ десятеро божїє приказаньє, Другая, вызнанье веры, Третяя Молитва г(оспо)дня. Четвертая часть наоука о тайнех х(ристо)выхъ* (арк. 106 адг.). Пра структуру ён не мог заявіць на пачатку 1-й часткі, верагодна, са стылістычных меркаванняў: каб у катэхізісе пачаць гаворку з базавых тэм і паняццяў (пра сутнасць чалавека як хрысціяніна), а не з другараднага, па сутнасці тэхнічнага паведамлення пра змест твора.

Парадак раздзелаў у НК адпавядае галоўным этапам развіцця рэлігійнасці вернікаў у яе лютаранскай версіі. Размяшчэнне дэкалога менавіта на пачатку катэхізіса, перад астатнімі раздзеламі, мусіла раскрыць верніку шляхі выратавання ад грахоў. Рэлігійны закон паказваў чалавеку кантраст паміж яго ўласным грахоўным жыццём і высокім ідэалам боскіх запаветаў (якія калісь былі ўласцівыя яму да грэхападзення, у раі). Гэта прыводзіла чалавека да ўсведамлення ўласнай грахоўнасці і адкрывала яму Хрыста, гэтаму прысвячаліся наступныя раздзелы катэхізіса. Нездарма менавіта ў 1-й частцы змешчаны ўсе адсылкі і алюзіі Буднага да сучаснага яму жыцця, якіх надзвычай бракуе ў астатніх раздзелах. Паказальна, што савецкія даследчыкі (С. Падокшын, Я. Парэцкі) заўжды грунтавалі свае высновы наконт поглядаў Буднага менавіта на аналізе толькі 1-й часткі; звесткі пра тагачаснае жыццё ў іншых частках НК проста адсутнічалі. Таксама нездарма Будны пры



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

разглядзе дэкалога неаднаразова закранае тэму караў за грахі і нядобрасумленныя паводзіны. *Иле ся дотычеть первоє части, Уже ведаю яко ся кажноє приказаньє розумееть, и яко оных богъ караеть которїи непослушны, яко теже милуеть послушныхъ* (арк. 106), – казаў Будны ад імя чытача свайго катэхізіса.

Інакшы падыход прапаноўваў Кальвін. Для яго дэкалог служыў ужо прамой і непасрэднай дырэктывай для штодзённых паводзін, ідэалам і ўзорам, прызначаным не для крытыкі жыцця верніка, а для пабудовы, арганізацыі такога жыцця паводле вышэйшых, хрысціянскіх нормаў. Таму ў Жэнеўскім катэхізісе дэкалог змешчаны на другім месцы, а папярэднічае яму тэалагічная падрыхтоўка верніка ў выглядзе разгляду сімвала веры. Для Кальвіна дэкалог разам з малітвай і сакрамантамі ўжо толькі фармавалі і афармлялі ўстойлівыя хрысціянскія ўяўленні і перакананні верніка.

Відаць, менавіта на гэтай падставе аўтары XVIII–XIX стст. лічылі НК лютаранскім творам. Аднак у помніку прысутнічае арыентацыя і на кальвінісцкую традыцыю. Напрыклад, як адзначаў Я. Камянецкі, падача асобных запаветаў у дэкалогу таксама адпавядае кальвінісцкай традыцыі.

Гэта можна ўбачыць і ў раздзеле пра малітву «Войча наш». Тут Будны, перш чым перайсці да аналізу малітвы Гасподняй, вядзе гаворку пра значэнне малітваў у хрысціянскім жыцці і разглядае некаторыя малітвы біблейных персанажаў. Малітву «Войча наш» ён падзяляе на 8 складнікаў: уступ (*предсловїе*), 6 просьбаў і заключэнне (*замкненьє*) (арк. 179 адг., 180). Такі падзел Гасподняй малітвы адпавядае рэфармацкай (кальвінісцкай) плыні, якая, паводле грэчаскіх тлумачэнняў, вылучала 6 просьбаў (тады як лютаране налічвалі 7 просьбаў, паводле Св. Аўгустына). Пад неадназначным прыметнікам πονηρός / πονηρόν ‘злы / злое’ (лац. malus / malum) у гэтай малітве рэфарматы (кальвіністы) разумелі д’ябла, а лютаране (разам з англіканамі і каталікамі) – больш агульнае неперсаніфікаванае зло. Будны тут ідзе следам за рэфармацкай плынню, паколькі вядзе гаворку пра *Сатону* і *диавола* (арк. 206, 207 адг.). Гэта адпавядае і праваслаўнай традыцыі.

Як было паказана, традыцыя хрысціянскіх катэхізісаў у XVI ст. – яшчэ не зусім сталая і аднастайная, а яе канфесійныя



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

межы – не зусім выразныя. Гэта дазваляла маладым аўтарам катэхізісаў, такім як Сымон Будны, выкарыстоўваць розныя ўзоры, без замыкання ўнутры толькі пэўнай канфесіі. Такія яскравыя маркеры, як колькасць частак (раздзелаў) у яго катэхізісе і некаторыя іншыя дэталі звязваюць яго з кальвінісцкай плынню, але парадак частак (раздзелаў) яўна паказвае на лютаранскую плынь. Таму Буднага можна лічыць не толькі пачынальнікам, але і наватарам беларускай і ўсходнеславянскай катэхітычнай традыцыі.

## КВАНТАТИВНАЯ КУЛЬТУРОЛОГИЯ: ПОТЕНЦИАЛ ДИСЦИПЛИНЫ В СИСТЕМЕ ГУМАНИТАРНЫХ НАУК

***Ю. И. Кнатько,***
*кандидат культурологии, доцент кафедры культурологии*
*Белорусского государственного университета культуры и искусств*

Современная культурология – интегративная область знаний, использующая для получения объективных данных не только критические и умозрительные методы гуманитарных исследований, но и эмпирические подходы естественнонаучных дисциплин. На стыке гуманитарных и естественных наук постепенно формируется предметное поле квантативной культурологии, ориентированной на выявление соотношения количественных и качественных показателей культурного развития.

На протяжении всей эволюции науки математическая логика, аргументация и анализ играли значительную роль в развитии рационального мышления, способствовали научным открытиям, решению социальных задач теоретического и практического характера. Интерес ученых к соотношению количественных и качественных показателей социокультурного развития возник еще в античный период (Гераклит, Гесиод) и особенно проявился в период Нового времени, когда были заложены основы квантификации (Г. Гегель, Ч. Пирс). Квантификация – это первичное измерение качественных признаков, выраженных в количественных показателях, то есть наделение числовым показателем какого-либо явления или события.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ